**08.04.2021 – ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЧАС Ў РАМКАХ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА «ШАГ»**

**Мэта:** фарміраванне жыццёвых каштоўнасцей для асабовай самарэалізацыі кожнага навучэнца.

**Удзельнікі: навучэнцы VIII – XI класаў дзяржаўнай установы адукацыі “Чудзінская сярэдняя школа”**

8 красавіка ва ўстанове адукацыі ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта Школа Актыўнага Грамадзяніна” адбыўся інфармацыйны час “Аб духоўнасці і маральнасці: дыялог пакаленняў”. У якасці запрошанага госця прымаў удзел іерэй Вячаслаў Наскевіч, настаяцель храма Святога Вялікамучаніка Георгія Перамоганосца ў аг. Чудзін.



На мерапрыемстве абмяркоўваліся пытанні духоўнасці і маральнасці, грамадзянскасці і патрыятызму, духоўнага адраджэння нацыянальных традыцый беларускага народа. Рабяты даведаліся аб Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне”, аб падзвіжніцкай асветніцкай дзейнасці Ганаровага Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. У ходзе мерапрыемства былі прадэманстраваны відэаматэрыялы з цырымоніі ўручэння прэміі “За духоўнае адраджэнне”. У рамках сустрэчы адбылася цікавая размова.



У інфармацыйным блоку «Мы даведаемся» сваё паведамленне навучэнцы пачалі з таго, што “людзі - істоты дзіўныя і непрадказальныя. Яны трацяць здароўе, каб зарабіць найбольш грошай, а потым трацяць іх, каб аднавіць сваё здароўе. У дзяцінстве яны мараць стаць дарослымі, а калі сталеюць, хочуць вярнуцца ў назад. Сёння людзі не заўважаюць і пераступаюць праз тое, што праз гады можа аказацца самай галоўнай для іх каштоўнасцю”.

Затым размова пайшла аб тым, што сёння, калі матэрыяльныя каштоўнасці дамінуюць над духоўнымі, у многіх людзей скажоныя ўяўленні аб дабрыні, міласэрнасці, велікадушнасці, справядлівасці, грамадзянскасці і патрыятызме. Сёння, як ніколі яшчэ ў гісторыі, усё больш адчуваецца дэфіцыт дабра і чалавечай цеплыні ў адносінах паміж людзьмі. Але

чалавецтва не можа існаваць без духоўных каштоўнасцей. Кожны чалавек сам вызначае, што для яго свята, што для яго дорага.

Асаблівая ўвага была нададзена маральным і духоўным каштоўнасцям, патрыятызму і грамадзянскасці ў сучасны час. Было адзначана, што для беларускага народа гасціннась, дабразычлівасць, талерантнасць, цярплівасць маюць асаблівае значэнне. А такія рысы нацыянальнага характару беларусаў, як дабрыня, спачуванне, працавітасць, адвага і самаадданасць - ёсць у кожнага з беларусаў. Айцец Вячаслаў патлумачыў, чаму людзі ў апошні час цэняць тое, што ім прыносіць дастатак, камфорт, у чым выражаецца заняпад маральнасці і што патрэбна рабіць, каб яго пазбегнуць. Таксама госць адзначыў, што патрыятызм праяўляецца ў неабыякавасі да таго, што адбываецца ў краіне, у актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Якасць патрыёта -актыўная грамадзянская пазіцыя - свядомае і актыўнае выкананне чалавекам сваіх грамадзянскіх абавязкаў, імкненне накіраваць свае здольнасці на карысць іншых людзей, а значыць, на карысць Радзімы.




Даведаліся рабяты і аб адраджэнні нацыянальных традыцый беларускага народа, аб прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне”, якая ужо больш за дваццаць гадоў прысуджаецца з году ў год вядомым дзеячам культуры і мастацтва, медыкам і педагогам, свяшчэннаслужыцелям і музейным работнікам за зацвярджэнне духоўных каштоўнасцей і маральных традыцый, ідэй міласэрнасці і чалавекалюбства, за прымнажэнне нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванне ў моладзі любові да Айчыны.

Не засталася без увагі і падзвіжніцкая асветніцкая дзейнасць Ганаровага Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, вялікі асабісты ўклад якога ў духоўнае адраджэнне беларускага народа былі адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Рабяты таксама мелі магчымасць паслухаць зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на цырымоніі ўручэння прэміі "За духоўнае адраджэнне", у якім кіраўнік дзяржавы звяртаецца да гасцей і лаўрэатаў цырымоніі, называючы іх гонарам нацыі.




У ходзе інфармацыйнага блока “Мы разважаем” навучэнцы актыўна абмеркавалі словы В.Г.Бялінскага і прыйшлі да высновы, што ў першую чаргу патрэбна быць выхаваным

чалавекам, чалавекам, які дастойны павагі, адзначылі, што жыццё, якое вартае чалавека – гэта жыццё, якое пабудавана на Дабры, Сумленні, Абавязку. Таксама рабяты выказалі свае меркаванні аб тым, што больш за ўсё стымулюе маральныя паводзіны людзей. А праслухаўшы прытчу, вырашылі, што любы ўчынак пакідае след у душы чалавека.

Айцец Вячаслаў адзначыў, што чалавек будзе шчаслівы толькі тады, калі будзе апірацца на такія каштоўнасці, як вера, любоў, міласэрнасць, дабрыня, пакорнасць і сціпласць, калі ён зможа перамагчы свае недахопы: зайздрасць і гонар, засмучэнне і ілжывасць, балбатлівасць і абжорства.

Затым рабяты задалі свае пытанні аб веры і жыцці. Адказваючы на шматлікія пытанні навучэнцаў, госць адзначыў, што ў паўсядзённай мітусні жыцця, у пагоні за матэрыяльнымі скарбамі забываюцца сапраўдныя каштоўнасці: духоўныя і маральныя. Вось таму так важна сёння кожнаму чалавеку, перш за ўсё моладзі, пачуць Жывое Слова духоўнай мудрасці.

Свяшчэннік гаварыў проста і даступна, таму ўсе слухалі з увагай і цікавасцю.

Падводзячы вынікі ў інфармацыйным блоку “Мы дзейнічаем” рабяты сказалі, што яны могуць ці гатовы зрабіць ужо зараз для росквіту сваёй краіны.

Госць айцец Вячаслаў падзякаваў усіх прысутных за цікавы дыялог, пажадаў дзецям і дарослым выконваць запаведзі Божыя, помніць свае карані, шанаваць сапраўдную дружбу і думаць аб сваім будучым.

Завяршылася сустрэча словамі вядомага педагога Васілія Аляксандравіча Сухамлінскага: "Вы жывяце сярод людзей. Кожны ваш учынак, кожнае ваша жаданне адбіваюцца на людзях. Ведайце, што існуе мяжа паміж тым, што вам хочацца, і тым, што можна. Вашы жаданні – гэта радасць або слёзы блізкіх. Правярайце свае ўчынкі свядомасцю: ці не прычыняеце вы зла, непрыемнасцяў, нязручнасцяў людзям сваімі ўчынкамі. Рабіце так, каб людзям, якія вакол вас, было добра …».

Сустрэча, якая прымусіла пра многае задумацца, атрымалася вельмі цікавай, насычанай і карыснай для ўсіх яе ўдзельнікаў.

*Д.І.Коўш, настаўнік рускай мовы і літаратуры*
*ДУА «Чудзінская сярэдняя школа»*
*Брэсцкая вобласць, Ганцавіцкі раён аг.Чудзін, вул.Савецкая, 149Б*
*Кантактны тэлефон: 8-01646-51 238 80333010754*
*E-mail: chudin@gancevichi.edu.by*